# ПІСЬМЕНСТВА – СЯБРОЎСТВА – АДЗІНСТВА

**Літаратары Гродзеншчыны прынялі актыўны ўдзел у мерапрыемствах XXIX Дня беларускага пісьменства, якія 3 і 4 верасня прымаў гасцінны Добруш, раённы цэнтр Гомельскай вобласці. Гродзенская дэлегацыя пераадолела шлях на свята даўжынёй у 700 кіламетраў праз усю Беларусь.**

Тым не менш удзельнікі свята прыбылі ў сталіцу XXIX Дня беларускага пісьменства натхнёнымі, настроенымі на творчы дыялог, на сустрэчы з калегамі з іншых абласцей, з мясцовымі аматарамі літаратуры і гасцямі Добруша, што стаіць на маляўнічых берагах ракі Іпуць, прытоку Сожа. Дагледжаны, утульны Добруш, горад з багатай гісторыяй, унікальнай архітэктурай і непаўторнай атмасферай нездарма называюць «беларускай Венецыяй». Акваторыя ракі Іпуць мае мноства мастоў і іншых гідратэхнічных збудаванняў. А яшчэ горад вядомы сваім фарфорам і сваёй папяровай фабрыкай. Шмат у каго ў памяці засталіся школьныя сшыткі, на якіх стаяў лагатып Добрушскай папяровай фабрыкі. Падумалася: каб не было гэтых сшыткаў тады, у школьным дзяцінстве, ці мелі б мы сёння дачыненне да слова? Наш агульны жыццёвы шлях у пэўнай ступені пралягае праз Добруш…

У склад дэлегацыі ГрАА СПБ увайшлі: паэт Мікалай Іваноўскі (Ваўкавыскі раён); пэтэса Таццяна Яцук (Навагрудскі раён); паэтэса, аўтар і выканаўца песень Надзея Салейка (Слонім); паэтэса Таццяна Лазарчык (Ваўкавыск). Паэт, аўтар і выканаўца песень Андрэй Татур з нядаўняга часу прадстаўляе не толькі горад Гродна, але і сваю малую радзіму – Дзятлаўшчыну. Яшчэ на свяце ў Добрушы пабывалі члены СПБ з Гродна: літаратуразнаўца, літаратурны крытык, паэтэса Аліна Сабуць; дзіцячая пісьменніца  Таццяна Сучкова; публіцыст-гісторык Уладзімір Ягорычаў; паэт, публіцыст Дзмітрый Радзівончык; лаўрэат IV абласнога конкурсу рукапісаў імя Цёткі ў намінацыі «Адкрыццё года», гродзенская паэтэса Кацярына Каламійцава-Ігнацюк. Наш калега па абласному аддзяленню СПБ – дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, паэт Валянцін Міхайлавіч Семяняка прадстаўляе літаратурную Зэльвеншчыну і сваю тэрытарыяльную выбарчую акругу – Слонімскі раён.




Мы адзіныя ў максімальна высокіх ацэнках працы прымаючага боку. Гаспадары сапраўды зрабілі ўсё для таго, каб кожны госць, кожны ўдзельнік свята адчуў сябе тут жаданым госцем. Той выпадак, калі асоба пісьменніка займае на свяце цэнтральнае месца. Асобных слоў падзякі заслугоўвае куратар нашай дэлегацыі, юрысконсульт Сектара прававой і кадравай работы ДУ «Цэнтр па забеспячэнні дзейнасці бюджэтных арганізацый Добрушскага раёна» Таццяна Вітальеўна Нікіценка. Як бачыце, у нашай камандзе – выхадцы з розных куткоў Прынёмання, апантаныя ідэяй творчасці прадстаўнікі розных пакаленняў, але ўсіх нас аб'яднала любоў да роднага мастацкага слова, праявы якой у розных, часам нават самых нечаканых формах у Добрушы можна было сустрэць літаральна на кожным кроку.

Аснову дэлегацыі склалі лаўрэаты III і IV абласных конкурсаў рукапісаў імя Цёткі ў розных намінацыях, аўтары, чые творы з’явіліся на старонках сёмага нумара альманаха «На Нёманскай хвалі». Пра гэта, а таксама пра іншыя свежыя набыткі, важкія падзеі з жыцця рэгіянальнай літаратуры ішла гутарка ў павільёне «Слова пісьменніка». Тут літаратурна-музычная праграма гродзенцаў пад назвай «Яднае нас роднае слова» пачалася з прэзентацыі праекта выдавецтва «Мастацкая літаратура» – рэспубліканскага літаратурнага зборніка «Лучнасць сэрцаў і дум» з серыі «Беларусь літаратурная» (укладальнік Віктар Шніп), кнігі якую нездарма можна назваць «літаратурным партрэтам сучаснай Беларусі». (Больш падрабязна пра зборнік з удзелам



Прэзентацыя зборніка «Лучнасць сэрцаў і дум». Укладальнік Віктар Шніп

аўтараў з нашай вобласці мы абавязкова раскажам крыху пазней). У праграме прэзентацыі Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ, акрамя чытання вершаў на беларускай і рускай мовах, разваг пра творчасць і мастацтва, гучалі аўтарскія песні. Тэма гістарычнай памяці знайшла працяг у непарыўнай духоўнай сувязі з вобразамі нашых папярэднікаў, славутых класікаў айчыннай літаратуры Якуба Коласа, Янкі Купалы, Максіма Багдановіча, Алаізы Пашкевіч (Цёткі), Элізы Ажэшкі і іншых. Пераемнасць традыцый, абарона ідэалаў патрыятызму і гуманізму сталі лейтматывам выступлення гродзенцаў на высокім рэспубліканскім узроўні. Прыемны момант – поспех нашай калегі па абласному аддзяленню СПБ. Вядомы ў краіне журналіст, таленавіты публіцыст, празаік Ніна Аляксееўна Рыбік з Астраўца перамагла ў Рэспубліканскім літаратурным конкурсе «Іван Шамякін. Сэрца на далоні», намінацыя «кароткае апавяданне». Сардэчна віншуем і ганарымся.





Дзмітрый Радзівончык



Мікалай Іваноўскі



Таццяна Лазарчык



Андрэй Татур





**Таццяна Сучкова**

**Уладзімір Ягорычаў**





**Кацярына Каламійцава-Ігнацюк**

**Надзея Салейка**




Таццяна Яцук




Аліна Сабуць



Шлюз на рацэ Іпуць



**Са старшынёй Гомельскага абласнога аддзялення СПБ, празаікам Уладзімірам Гаўрыловічам**




**На канцэрце ўрачыстага адкрыцця свята. Спявае Ірына Дарафеева**





**Спявае арт-група «Беларусы»**

Цэнтральнае месца ў мерапрыемствах XXIX Дня беларускага пісьменства адводзілася Году гістарычнай памяці, юбілеям пісьменнікаў мінулага і сучаснасці, 140-годдзю з дня нараджэння Песняроў Радзімы – непаўторных сімвалаў роднай літаратуры і культуры Янкі Купалы і Якуба Коласа, 110-годдзю з дня нараджэння Максіма Танка, 105-годдзю з дня нараджэння Пімена Панчанкі і Янкі Брыля, 95-годдзю з дня нараджэння Алеся Адамовіча.



У праграме канцэрта СПБ «У сэрцы з любай Беларуссю» выступае паэтэса Таццяна Яцук


На галоўнай сцэне XXIX Дня беларускага пісьменства
паэт Андрэй Татур


Тэхналогіі свята



Вядучыя канцэрта – паэтэса, кампазітар, спявачка Таццяна Атрошанка (Маладзечна) і гродзенскі паэт Дзмітрый Радзівончык






**Горад майстроў**





**Таццяна Сучкова.**
**Незабыўная атмасфера святочнага Добруша**




**Дэлегацыя пісьменнікаў Гродзенскай вобласці ля помніка Івану Шамякіну. Добруш, 4 верасня 2022 года**

Мы выказваем сардэчную ўдзячнасць усім, хто спрычыніўся да арганізацыі ўдзела Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі ў мерапрыемствах XXIX Дня беларускага пісьменства. Бывай, Добруш! Да сустрэчы ў Гарадку-2023 на юбілейным, 30-м свяце роднага мастацкага слова.

ПРЭС-СЛУЖБА СПБ-ГРОДНА